ВОЛЬНАЯ БЕЛАРУСЬ

Цэна асобнага № 15 кап.

Умовы падпіскі на 1917 год.

За 1 м.	За 2 м.	За 3 м.	За 4 м.	За 5 м.	За 6 м.	За 7 м.	За 8 м.	За 9 м.
1. 50	3 р.	4 р	5 р.	6 р.	7 р.	8 р.	9 р.	10 р.

Падпіска прымаяцца толькі с 1-го чысла кожнаго месяца.

Перамена адрэсу—50 коп. Пры зьмені адрэса конча прыкладаць стары адрэс.

Рукапісы павінны быць чытэльна напісаны і толькі з аднаго боку паперы. Кепска перапісаныя рукапісы ні чытацца, ні друкавацца ня будуць.

На ліставання, перасылку рукапісау і іншыя адказы-павінны прыкладацца маркі.

Газэта палітычная, эконамічная і літэратурная.

Адрэс рэдакцыі і адміністрацыі: Мінск, Захар'еуск. 18.

Умовы друку абвестак:

(На IV боку газэты) за 1 радок шпальту 40 к. за 2 рад. 80 к. за кожны раз.

Асобам, шукаючым працы — 1 руб. за 3 радкі за адзін раз.

№ 3. **(Ауторак)** **Выходзіць двойчы на тыдзень.** **(20 июня)** **№ 3.**

ГРАМАДЗЯНЕ-БЕЛАРУСЫ!

Па ліку газэт, кніг і журналаў Беларусь самая бедная у Дзержаві Расійскай. Наша сьвятая павіннасьць дапамагчы пашырэньню друкованнаго слова.

Беларусы! Злучайцеся у гурткі, ў сяброўства, зьбірайце грошы на фонд «Вольнае Беларусі», арганізуйце падпіску, шукайце прыхільнікаў, спагадачоў і чытачоў. Памятайце, што, калі мы самі аб сабе ні падбаем, дык ніхто нам ні паможа. Наша справа у нашых руках. Хто дбае, той і мае. Складайце фонд «Вольнай Беларусі»!

РЭДАКЦЫЯ.

НАСТАУНІЦКІ З'ЕЗД.

На прыканцы мая адбыўся у Мінску з'езд настаўнікаў, або селянскіх вучыцялёў Мінскай губэрні. На усіх, хто быў там наўмысьля ці трапіў туды выпадкова, гэты з'езд адбіўся бяз конца цяжкім ўражэньням. Слухаючы прамоўцаў на з'ездзі, ня хацелася даваць веры, што гэта дзеяцца у рэвалюцыйнай Расіі, што перад вамі дзеці народа, тыя працаўнікі, што па агульны пагляд, «сѣютъ разумное, доброе, вѣчное». «Здавалася,» пісала мейсцовая расійская газэта «Товарищъ,«што гэта парада парахвіяльных папоў, разважаючых пытаньне, як найлепей выславіць «чувства безпредѣльной любви къ обожаемому монарху». Ад прамоў іх патыхала вогкасьцю склепа і такой архаічнасьцю, кансэрватызмам, адсталасьцю і дзікарствам, што нехаця, якось само сабой паўставала пытаньне: што гэта—з'езд настаўнікаў ці «собраніе истинно-русскихъ людей?» Старасьвецкіе прамовы дакладчыкаў, з'дзек і выскаляньне з усяго роднаго, беларускаго, нізразумелая пагарда і пакепліваньне с таго, што ні расійскае, крывавая помста немцам, баязлівасьць таго самага народу, адкуль яны вышлі і вучыць каторага яны прыстаўлены —вось тыя матывы, што панавалі на з'ездзі, тыя мацнейшыя мэлёдыі, ад каторых настаўнікі с фронту затыкалі вушы ды уцякалі вон з пасядзэньня.

Ні маючы на увазі гаварыць аб тым, што там дзеялася наагул, цікава нам спыніцца на тым, як стасавалася беларускае вучыцяльства да беларускае справы. Тым больш, што супыніўшыся на гэтым, ня трудна будзе дагадацца, што магло зрабіць яно у справах іншаго зьместу,—пэдагагічных, палітычных і грамадзянскіх.

Бо досыць сказаць, што ўсе даклады кансэрватыўнаго зьместу праваджаліся аплёдысмэнтамі і з'ездам ухваляліся, каб зразумець, у якім кірунку разважаліся пытаньня.

Стасоўнасьць з'езду да беларускае справы выявілася с першага дня. Пачаць с таго, што адна вучыцялька за прамову па-беларуску была абсьмеяна, спынена і нават цяжка абражана.

Трэ было бачыць, як шчыра і сумленна вярадавалі і абражаліся настаўнікі, што на іх з'ездзі, на з'ездзі гаспод-вучыцялёў, хтосьці адважыўся загаварыць да іх на «мужыцкай гаворцы», на «простомъ нарѣчіи», як ахрысьціў старшыня з'езду беларускую мову, тую самую мову, якая панавала ў урадавым ужытку ва усём Літоўска-Рускім гасударстві і цяпер сярод 10-і мільённага беларускаго народу.

Беларуская справа? Далоў, прэч яе! Гэта турбуе мазге, варочае да гары нагамі усю тую учобу, якую пугалі яны с сэмінарскай крыніцы прамудрасьці, ніпічыць да шчэнту іх жыцьцёвы пагляд і робіць ім асабістую ніпрыемнасьць. Яны-ж бо увесь час прапанавалі народу, што ён ні ён, і мова ні яго, і што уся беларушчына адна толькі брыдота, якую чым хутчэй забудзеш, тым яно лепш будзе. Не, выбачайце, беларускае справы німа. Гэта выдумка, махлярства і іх ні падашукаеш. Асабліва, калі узяць на увагу, што гэта патрэбуе развагі, думак і працы...

Барані Божа! Працаваць і думаць яны ні вучыліся. Яны вучыліся за паноў і ў сэмінарыі ім ясна даводзілі, што настаўніку многа ведаць ня трэба, а знацьё—рэч нібяспечная, шкадлівая. Многа аб чым даведаешся, дык часам і ў катаргу трапіш. Бывалі здарэньня, прыкладаў ні мала. Настаўнікам трэба крыху навучыцца расійскай граматыцы, цьвёрда пракапацца, што яны «исконѣ русскіе и праваславные», а усё ліха на сьвеці ад палякоў, ды ісьці спакойна на вёску калечыць душы дзяцей і вучыць добрых людзей так, каб чалавек мог расьпісацца у валасьці, ідучы пад арэшт на высідку.

А тут на табе, ахцыкі якія! Беларуская справа, мова, культура, адраджэньне... Далоў, гэта вунія, польская інтрыга. Аб гэтым мы у сэмінарыі чулі і ні такоўскіе мы, каб якісь там «беларус» нас падцукраваў. Сьмяхота ды годзі,—вучыцца па-беларуску!.. Ды ці німа тут гэрманскага шпігоўства?!

І можна было бачыць на з'ездзі, як гэтыя «сьветачы народные», папакупляўшы беларускіх газэт, рвалі іх на шмацьця, шпурлялі на падлогу ды таптал нагамі... Што гэта, чытачу,—барбарства, глупства ці нідавумства?!

«Калі справядлівая пагудка», піша вышэй-памянёная газэта: «што нямецкі вучыцяль у свой час перэмог французаў, дык беларускі настаўнік, с адным скарбовым клункам у глуздзі, гэты прыхвасьцянь папоў і паліцэйшчыны, нікога ня пераможа; што ад сяўбы гэтых сяўбітоў вырасьце чэмяр, а ні разумнае, добрае, вечнае. Трэба як найхутчэй ліквідаваць казённую і інспэктарскую школу і на руінах яе пабудаваць народную беларускую з навучэньням у роднай мові, і толькі за гэтакую школу скажа шчырае «дзякуй» беларускі народ».

Сучаснаму беларускаму вучыцяльству, прынамсі, у тым яго складзі, які выявіўся на гэным з'ездзі, беларус напэўна ня выславіць падзякі. Гэта, калі ні разумеюць, дык адчуваюць яны самі, бо на паветавым з'ездзі, напрыклад, яны рыхтаваліся арганізавацца у тым сэнсі, каб адгарадзіцца ад народу, бо, як шчыра прызнавалася адна настаўніца, селяне іх ня любюць, смяюцца, «ні даюць дроў на апалу» і дражнюць дармаедамі і гультаямі. Ці зрабілі яны якую пастанову ці не—німа ведама,—паны-настаўнікі ня прывыклі выносіць сьмецьця с хаты і публічнасьць ні надта шануюць,—але можна было бачыць як пацiскалі людзі плячыма ды пыталі: што гэта—«чайная саюза рускага народу», ці з'езд Салаңевічаў, Кавалюкоў і Акаловічаў?«

Над нацыянальным пытаньням з'езд дарэмна галавы ні турбаваў. Усё ім ясна, проста і зразумела. Досыць разгарнуць гісторыю Цуцыковіча або Брянцэва, каб кожнаму пабачыць, што, як і да чаго. І вось, дзеля пракананьня слухачоў, што беларускае мовы ніколі ня было і беларусы дарэмна з гэтым спрачаюцца, дык дакладчык па нацыянальнаму пытаньню прыводзіў артыкул з «Літоўскаго статуту»: а «пісар земскі мает па-руску словы і літары позвы пісаці, а не іншым ензыком і літарамі». Слухай дабрадзейства, па-руску, а ні па-беларуску. І саля з'езду грымацела ад усплескаў «тавырышаў-прафэсароў», як мянавалі сябе настаўнікі. Слухаючы такое пэўнае тлумачэньня гістарычных дукумэнтаў, мабыць ні адзін «прафэсар» назайдросьціў яснасьці, пэўнасьці і пракаланасьці дакладчыка. Вот дзе галава!. І то скажы, гад, выкапае, раскусіць і дадасьць да рэчы. А як скажа, дык як звяжа!

Ніпатрэбнасьць аўтономіі для Беларусі дакладчык аргумэнтаваў тым, што нельга будзя карыстаць з багацьця «Матушки-Россіи» і ня дастанеш газы(!). Ergo, аўтономія—гэта хітрыкі, вунія с Польшчай і-боляй нічога.

Каб «навучна» пракапаць, што беларускае мовы німа, што гэта жаргон, расійскі правінцалізм (паветалізм) дык дакладчык пасылаўся на Карскаго, Шэйна, Сербава і інш.

Уся праца людзей ахвярована беларушчыні, яе мові, творчасьці і літэратуры, а селянскіе «прафэсары» умудрыліся, тым часам, скарыстаць яе па своему. Хтосьці сказаў, што каб «двойчы два-чатыры» перашкаджала інтарэсам людзей, дык-бы напэўна-б людзі і досі спрачаліся з гэтым.

«Уся навука, гісторыя, усе сусьветные педагогі, як Ушынскі, напрыклад, прапапуюць», прамаўляе беларус-вучыцель: «што без навучэньня у школах на роднай мові»...—«Брэхня!» абсякаюць прамоўцу настаўнікі: «гэтага ніхто ніздзе ні казаў»...

У кулуарах з'езду тые з вучыцялёў, у каторых яшчэ тлея іскра жыцьця, наўпа прызнаваліся, што, калі згадзіцца с беларусамі, дык прыдзецца страціць пасады, бо яны увесь час насьміхаліся з беларушчыны, мовы забыліся і вучыць па-беларуску ні здольны. Як бачым, нават у сумленняйшых і лепшых сярод іх, скурны інтарэс на першым мейсцы і засланяе вымогі часу, вялікай праўды і справядлівасьці. Наагул-жа, з'езд выявіў нічуванае ў гісторыі зьявішчэ. Сыны народа, сьветачы вясковай цемры, адракліся ад бацькаўшчыны сваe, адцураліся мовы бацькоў сваіх і на ўвесь сьвет выславілі, што яны нінавідзюць усё роднае, беларускае і рады і надалій цягнуць ярмо маскоўшчыны і нацыанальнаго уціску. Мала таго, яны ахвотна згадзіліся ускладаць ёрмы паддапства і на тых меньшых братоў сваіх, каторые будуць ухіляцца. Актыўна абараняючы сваё рэнегатства, яны упарта перэшкаджалі тым таварышам, каторые сапраўды жадалі азнаёміцца з Беларусіей, яе гісторыей і сучаснымі вымогамі. І у зладзействі прыемна мець прыхільніка. Прынамсі уцеха будзе на уселякае здарэньня: ні я адзін—і той гэтакі самы...

Ня ведаюць, што тварацъ... Яны павінны ведаць, гэта сьвятая павіннасьць кожнага грамадзяніна. А калі да гэтага часу ня ведаюць і ведаць ня хочуць, дык «з дурня—глупая навіна! Хто наш звычай ці ігрышча на пасьмейшча падыме,—што-ж з яго край родны зышча? Што-ж с пустой каліты выме?!»

Рабы былі і рабамі засталіся.

«О, поле, поле! Хто цябе—усыпаў мёртвымі касьцямі?!»

Я. Л-к.

Цар ці рэспубліка.

(Канец).

Цяпер у нас німа цара і хутка зьбярэцца Устаноучы Сэйм (Учредительное Собраніе), дзе трэ' будзе раз назаусёды развaжыць і пастанавіць: ці патрэбян нам цар, ці не. А калі ні патрэбян, дык, значыцца у нас павінна быць рэспубліка (народапраўства).

Пры цару усім валадау і кіравау ен сам. Хоча ен даць каму—колечы зямлю, дык ен дае. Але заусёды было гэтак, што ен народу зямлі ня давау. Гэта і зразумела: каля яго больш былі і удыгалі фабрыканты і паны, каторым зямлі нагвалт ня хочацца аддаваць. Хоча ен зрабіць, каб рабочым на заводах і фабрыках жылося лягчэй і каб плацілі за працу даражэй,—ен гэта зробіць. Толькі цары гэтаго ніколі ні рабілі. А захоча ен, каб у весках былі і усім камандавалі земскіе начальнікі с паноу,—ен пасылау туды земскіх начальнікау. Хоча цар пачаць вайну, дык ен яе пачне, а царскіе чыноунікі пагонюць народ на бойню. А другіе чыноунікі будуць дастауляць у армію хлеб, адзежу, боты, гарматы, бомбы і інш. ды красьці: салдат будзе галодны і халодны, і ваявацъ пойдзе на паперовых падноскaх, з голымі

рукамі, бяз куль і гармат. І будуць яго біць. А калі хто паскардзіцца на казнакрадоу, дык яму-ж горай будзя. Ды й каму скардзіцца? Тым-жа сэмым казнакрадам, каторых пасадзіу цар. А калі-б хто паважыуся у газэтах надрукаваць,—дык гэтага царскіе цэнзары ні дазвюлоць.

Гэтак бывая пры манархіі самадзяржаунай, калі цар ні да чаго ні прымушан.

Прауда, у іншых гасударствах бывае Гасуд. Дума, або, як яе называюць заграніцай, парлямэнт. Дэпутатау у гэты парлямэнт выбіраюць ні адны багатые людзі, як гэта было у нас, а увесь народ. Тагды законы разважае парлямэнт. І перад ім адпаведаюць міністры. Парлямэнт можа патрэбаваць, каб яны падаліся у адстауку.

Гэткая манархія завецца парлямэнтарнай. Там уладарства гэтак сама трымае цар, але ні зусім. Прауда, калі ен ня згодзіцца на які закон, дык, хоць-бы парлямэнт і хацеу, закон ня можа увайсьці у жыцьце. Калі-б, папрыклад. у такім гасударстві парлямэнт пастанавіу адабраць зямлю у паноу ды аддаць яе селянам, зямляробам, дык цар мае там права ні згадзіцца з гэтым, пастанова парлямэнту спасуяцца. С пасланцамі чужых гасударствау, цар размауляе адзін, ні заклікаючы нікога к сабе на параду, і умауляецца з імі гэтак, як сам хоча, ні зьвяртаючы увагі на тое, ці згодзіцца на гэта парлямэнт. У такіх гасударствах цар пачынае вайну хоць бы парлямэнт і ня хацеу.

Зусім іншая справа у Рэспубліках. Там зусім німа цара, а есьць толькі прэыздэнт рэспублікі. Ен ні сам займае пасаду сваю, а выбіраецца усім народам. Цар робіцца царом на моцы спадчыны ад бацькі, а прэзыдэнт абіраецца на які нібудзь тэрмін,— на тры гады, на чатыры, на пяць, а іншы раз і на сем год, і выбірае яго народ у розных гасударствах ні аднака. Дзе колячы яго абірае парлямэнт, або Дума, а у іншым гасударстві народ выбірае сперша выбарщчыкау, а тые, зьехаушыся разам, радзяцца ды абіраюць прэзыдэнта. А бывае і гэтак, што увесь народ падые голас за каго-небудзь аднаго, калі ен таго варт і здолян да гэтай пасады. І вось, калі, скажам, Біруля, атрымае найбольш галасоу, дык прэзыдэнтам і будзя Біруля, а калі за Ксяневіча, дык прэзыдэнтам будзя Ксяневіч. Гэты прэзыдэнт Біруля ці Ксяневіч будзя кіраваць усяго тры, чатыры ці пяць год,-потым ізнсу трэба выбіраць. Другі раз яго выбяруць толькі на той выпадак, калі ен добра кіравау і спадабауся народу. А калі ен кепска кіравау і народу ня спадабауся, дык яго зноу ня выбяруць. І кіраваць гасударствам прэзыдэнт будзя ні так, як хоча, а як загадае яму парлямэнт, выбраны гэтак сама на колькі год усім народам.

Парлямэнт у Рэспубліцы выбіраецца народам, вось гэтак сама, як мы цяпер, маем выбіраць дэпутатау да Установчаго Сэйму.

Калі парлямэнт пастановіць, што трэба адабраць зямлю у вялікіх паноу ды аддаць яе тым, хто на ей працуе, дык гэтак і будзя, бо прэзыдэнт ня мае права ня зрабіць гэтаго. Ен есьць пачэсны служка усяго народу.

Хутка нам трэ будзя выбіраць лепшых, разумнейшых людзей да Установчаго Сэйму. Сэйм павіняи перш-на-перш абмяркаваць і пастанавіць, ці патрэбян нам які небудзь цар, ці Дзяржава наша павінна быць рэспублікай.

Народ павінян выбіраць дэпутатау да Установчаго Сэйму, і яму трэ вельмі падумаць, чаго яму трэба і каго выбіраць, бо што пастановіць Сэйм, таго ня пераробіш праз соткі год. Трэ будзя зноу рабіць рэвалюцыю. І вось, калі народ хоча, каб у нас быу цар, дык ен выбярэ такіх дэпутатау да Сэйму, каторые будуць галасаваць у Сэймі за цара. А калі народу патрэбна рэспубліка, дык ніхай ея выбірае такіх дэпутатау, каторые пададуць свае галасы за рэспубліку.

В. Водовозов.

Кароткі фэльетончык.

Мікіта абстаівае сваіх.

Мікіту выбралі дэпутатам на селянскі зьезд. Глядзі-ж, Мікіта, бараві нашые справы, казалі выбаршчыкі. —Ні слухай папоў, ці купцоў там якіх,—яны ворагі нашы і ніколі дабра нам ня жадалі. Ты павінян памятаць, што ты селянін, хлебароб, як усе мы, дык і стой за тое, што трэба нам, каб лягчэй і вальней жылося. Мы-ж цябе пасылаем ад усяго обчэства.

Мікіта зьняў шапку, нізінька уклаціўся ды кажа:

—Дзякую, братке, за паважэньне! Буду як мага абстаіваць вас і вашы справы. Ці-ж я, ніхай Бог крые, блазан які, ці што, каб ня ведаць што сказаць?! Барані мяне Божа, зрабіць што кепскае для обчэства. Вашы справы, гэтак сама палежаць і да мяне. Буду выказваць усё, што нам патрэбна. Хоць-бы галаву адсеклі мне, дык ні здраджу вам, братке мае,—паны-брацьця!

—Маладзец, Мікіта, малайчына! гукалі селяне.—Ніхай табе Бог дапаможа абараніць нашы жаданьня!

—Дык я заўсёды казаў, што Мікіта-галава! дадаў хтосьці з гурту.

—Ні спяшайся, ягомасьць! Пахвалім, як прыедзе, дадаў нехта ў адказ.

Дзён колькі прабыў Мікіта на зьезді. Усё што гаварылі, ён трохі кеміў, трохі не. Так яму нічога і ня удалося сказаць. Іншы раз, праўда, у яго руку гаварылі, дык ёнківаў галавой і згаджаўся. Нават пляскаў у ладоні, глядзючы на другіх.

—Ну, што-ж там, Мікіта, чуў на зьездзі? пыталіся селяне, абступіўшы яго на вуліцы,

—Э, браточкі, дзякаваць Богу! Цяпер зямелька уся наша будзе, і мы мецімем гэтакія самыя правэ, як усе панэ... Але ці ведаеце, што? Нашліся гэтакіе ахцыкі, што хацелі, каб у нас завесьці нейкі «беларускі язык». Ду-удкі, пане мой. Цяпер нас ня падашукаеш.. А... як-жа? Патрэбян нам гэты «язык»...

—Як ні патрэбян? Гэта-ж наш родны, уласны «язык»,—перабіў яго нехта.

—Што-ж ты у маскоўцы, ці у паляке запісаўся?

—Вот табе і Мікіта! Ад свае мовы адказаўся...

—Дык я ж, браточкі...—апраўдваўся Мікіта.

—Уся наша зямелька—Беларусь, а мова наша беларуская, і калі ты ад гэтага адказаўся,—загаманіў салдат, прыехаўшы с фронту: дык лепш-бы ты галавы свае адказаўся. Дзе-ж твой глузд быў?! Гэта ім будзе добра, толькі ні табе. Каго ты слухаў?!

—Дык я, братке, ня ведаў. Чуў я, што калі завядзецца у нас беларускі язык, дык нас атдзелюць ды да Польшчы прылучаць. А там кароль ёсьць гатовы ля нас... А на зьездзі гэтакіе усе добрыя, таварышамі завуць і гэтак хораша аб нас адклікаюцца. Няўжож яны зла нам хочуць?.. Бадай-жа іх пярун спаліў!..

—Эх, Мікіта, Мікіта! Нарабіў ты, братка, клопату як тая баба у казцы, сказаў стары сівы дзед. —Прачуў вось маскаль,*) што у бабы многа грошы, але ня ведаў, як іх сьцебануць. Узяў ён кварту гарэлкі, прышоў да бабы ў хату ды стаў яе частаваць. Мужыка дома ня было, на кірмаш ці на заработкі паехаў. Маскаль такім добрым зрабіўся, што ое-ёй. Баба павясялела,-ведама, гарэлка зашаламіла. У кароткі час яны зрабіліся сябрамі. Стаў маскаль скакаць, а скакучы прыпеваць: «У бабушки деньги есть, деньги есть, да не знаю, какъ подлѣзть, какъ подлѣзть!» Як усхопіцца баба, ды як пойдзе у прысядкі: «у каморы за дзьвярыма,-у корабі, ў перы.» І пашлі скокі. Наскаўшыся, баба крыху прыкархнула, а салдат забраў апошні скарб с хаты ды пашоў у сваю дарогу. Бабі і на шчопцю перцу ні засталося.

Вярнуўся да дому мужык. Вось баба і хваліцца: «А мой-жа ты, Яначка, што я табе за навіну скажу.» І расказала баба усё, як было.

—А пляга на цябе! рыпнуўся на яе мужык. Гэта-ж цябе маскаль падмануў! А ці цэлы грошы, паглядзі!»

—А то-ж ён возьме, гэтакі добры салдацік!

Глянулабаба і залямэнтавала, сьлязьмі абліваючыся...

Міхась Мяцёлка.

Размова аб з'ездзі вучыцялеу.

—Скончыўся з'езд? Раскажэця: як, што?

—Вучыцельскі з'езд у Мінску?

—Але!

—Пачакайця, дайця атдыхацца. Ну, і спякота-ж сягоньня! Забыўся узяць парасона... Емкая дзяўчынка ваша суседка! Глядзіця—вун пабегла. Каб ей уборы...

—Ведаю, потым. Аб чым гаварылі вы там, з'ехаўшыся?..

—Ух, саўсім сасмаліўся, пакуль да вас дабраўся. Бытцым рыбалоў -увесь мокры, аж рагі пацяклі. Німа пане-

*) маскаль-салдат; гэтак сама па беларуску маскаль-велікарус.

ЧУЖАЯ.

Першая служба Васілёвай Наталцы трапілася зусім добрая: яе узялі у двор да маленькага паніча. Двор быў блізка ад вёскі, паны знаёмые, дзіця спакойнае. Апрача маленькаго паніча, Казі, каторага прышлося няньчыць Наталцы, была і старшая панепка Ядзя, дзяўчынка гадкоў 9—10. З гэтай скора падружылася Наталка і нават вучыцца з ёй стала. Добра было і на яду, і дамоў блізка, кожнае сьвята, а то і у будні дзень дападзе Наталка у родную вёсачку.

Ня дзіва што пры гэткай службе год кончыўся скора; Наталка думала і на другі барыш паніць, калі неўспадзеўкі прыпісаў ліст Наталчын дзядзька, каб Наталка прыезджала да яго. Дзядзька жыў у вялікім горадзе, і абецаўся крыху падучыць Наталку, а тады найсьці добрую службу. Хоць служба Наталцы была і тут добрая, але дзядзька абецаўся вывясьці яе у людзі. Прышлося ехаць.

Хто ж ня ведае, як цяжка растацца з сваімі, з роднай вёскай? Хіба той, хто ні разумее усей чароўнай цякноты вясковых малюнкаў, або той, хто з імі ніколі не разставаўся...

Плакалі паны і Ядзя, калі адвітывалася з імі Наталка, бо шчыра прывязаліся да добрай дзяўчыны, пішчэў, абхапіўшы ручкамі шыю «пяні» малы пястун Казя,—а і Наталцы слёзы ні давалі гаварыць...

Але калі на заўтра раніцай бацька запрог маленькага каштанчыка у калёсы, на каторых былі ужо зложэны усе пажыткі Наталкі, калі галасна прычытывала маці, а бацька неўзнак абціраў рукавом вочы, калі прышлося сесьці на гэтые калёсы і апошні раз пераехаць праз родную вёсачку—тады пачуяла Наталка што слёзаў у яе нехват, а толькі нешта у грудзях баліць і ные.

І сама яна ня ведала чаго горш шкада: ці старых бацькоў, ці хаткі, ці гародчыка, дзе ужо цьвілі красачкі, ці срыбнай рэчкі, што бліскучай істужкай апіразала сенажаць, ці цёмнаго бору, што сваім рэхам так часта памагаў ёй пеяць...

Але сэрцэ маладое ня доўга бывае сумным. Калі бацькаўшчына схавалася з вачэй Наталкі, а цягнік с свістам і грукам лётам птушкі панёс яе па незнаёмай дарозі, Наталка ужо супакоілася і думкі аб дзядзьку, аб горадзі, сталі праганяць думкі аб роднай вёсцы...

. . . .

Вядомая рэч трудна было прывыкнуць Наталцы да повага жыцьця, але да чаго не прывыкне чэлавек, ды яшчэ і малады!..

Дзядзька споўніў сваё слова, вучыў Наталку, а пасля дастаў ёй службу. Зноў было ня кепска, аценілі Наталку за яе добры характэр і спагаднасьць, мела і пашану і гасьцінец....

Да бацькоў часта яна пісала.

Вельмі хацелася Наталцы з'езьдзіць дамоў, пабачыць і бацькоў, і сяброў, і старошку, але служба хоць і добрая,—няволя: трымала яе у горадзе, як у клетцы, а гады усё ішлі, плылі, як плыве вадзіца у рэчцы.

І ня скора прыехала дамоў Наталка. З якой радасьцью села яна на цягнік, лічучы ця толькі гадзіны—мінуты, калі убачэ усё тое, за чым так маркотна было...

Вёску Наталка мала памятала; і найбольш яна думала цяпер аб ёй, стараючыся прыпомніць яе і усіх сваякоў і знаёмых. Але непаслухняные думкі не давалі патрэбных малюнкаў, варочаючыся да горада, дзядзькі, новых знаёмых, плуталіся, туманіліся успаміны. Тады Наталка старалася ні аб чым ня думаць

. . . .

. . . .

Чуць толькі, стукнуўшы, астанавіўся цягнік на станції, трымаючы у руках клункі з гасьцінцамі для усіх, першая выскачыла з вагону Наталка, шукаючы вачыма свайго бацькі. Яго Наталка добра помніла... Божэ! Чуць спазнала! Ня той, зусім ня той, якога ясную постаць насіла у душы... Сівы, згорблены... Толькі ўзгляд такі самы: ласкавы, прыветны, і у вачах мігаціць нешта—ні то агоньчык, ні то слязінка...

«Дзетка мая дарагая! Наталачка!»

Яе, яе дарагі татка! С крыкам радасьці кідаецца да яго Наталка, цалуючы чорные, запрацаваные рукі...

«Но, каштанчык!» І той самы конік, і калёсы, і усё знаёмае—але нейкае другое...

«Што тут перамянілася?»—пытаецца сабе Наталка: «хто? я, ці ўсё, ці яны?»

Стараецца завясьці з бацькам гутарку, хочэ сказаць яму так многа,—а тут у яе шчэбэтанне мешаюцца чужые, другіе словы, як фальшывая нота у стройна пеянай песьні. І ня усе гэтые словы разумее стары бацька, часам здзіўлёна гляне на Наталку і тады яе твар пачырванее, як кветка рожы...

Неяк дзіўна Наталцы на сэрцы, як бы нехват чагось і стыдна, што з родным бацькам гаварыць ня умее...

Сорамна ёй гэта... і стараецца ужо маўчаць... Хай стары тата гаворэ, а яна будзе слухаць, слухаць і вучыцца... Ніхай у сэрцы аджывае забытая гутарка, як аджывалі калісь то, насьля дзеннай гарачыні, красачкі у гародчыку, паліваные ручкай Наталкі... Хай што найбольш гутарыць татка, бо Наталцы так хочэцца прыехаць у вёску такой, якая выехала, роднай мовай прывітаць усіх і усё...

Шпарка бяжыць стары каштанчык, падскаківаюць на каменьнях калёсы, і баліць ужо Наталцы галава ад гарачыні, пылу і дрогкай язды. Адвыкла яна і ад гэтага...

Вот уехалі у вялікі бор. Ен ні зьмяніўся, такі самы, але пасьля гарадзкой цеснаты, выдае такі вялікі, прасторны, вясёлы, такі поўны сьпеваў птушак, паху кветак, смалы...

Наталка злазе с калёс і бяжыць побачкі с каштанкам, каторы так сама стараецца, як мага, скарэй папасьці дамоў; ей лёгка, радасна; хочэцца рваць цьвітучы верас, пеяць, сьмеяцца, пабегчы скора-скора і далёка у гэты бор... Ах, як добра, прыемна!..

Канчаецца бор, радзее... Вось зараз пакажэцца вёска...

Наталка садзіцца на калёсы, зачыняе вочы, яна атчыне іх, як яны выедуць з лесу і будзе відаць ні адна хатка, ні гумнішчэ, але уся, уся вёска, і двор, дзе служыла Наталка, і дрэўцы, і кусьцікі, і рэчка... Ах, каб скарэй! Но, каштанчык!

Зашумелі колы па пыльнай дарозе, —выехалі з лесу...

Атчыняе вочы Наталка... і зноў хочэцца зачыніць іх... Вёска... але ці такая, якую думала убачыць Наталка?! Божэ! Чаму хаты так асунуліся?.. Такіе чорные, крывые, маленькіе... Няўжо тут жывуць людзі, жыла тут і яна, Наталка, і... будзе жыць? Зноў неяк дзіўна на сэрцы... апусьціла вочы Наталка перед узглядам бацькі, замоўкла...

Шукае вачыма яна свай хаткі,

нак—зніму каўнерык. Распарыўся і надта пахня. Паслухаў, угаварыла чарумка купіці гэту дрэнь... Пачынаю, пачынаю. З'ехалася многа вучыцеляў, вучыцелак. Даражэнькі мой! Ніколі ні думаў, што у нас ёсьць гэткія кветачкі...

—Цікавіць мяне...

—Момэнт часу, толькі хвілінку. Пекныя, прыбраныя. Здаецца, папаў у вялізарны агародчык і усе усьміхаюцца табе. Ні разбярэш, каторая ямчэйша. Эх, харошы Божы сьвет!... Я перш сароміўся: потым, стой, думаю: гэтак ні гожа. Перш вусы прэч, потым пальчаткі сюды, ды па вашаму —ў атаку... Усе добра было, але як зьявішся на Губэрнатарскую, мотаппа. Там усё галіфэ, фрэнчы, корцікі. І мне вучыцелькі толькі і шэпчуць: «душка, душка»...

—Аб з'ездзе, будзьце ласкавы...

—А я аб чым? Аб ім і гавару. Усё вельмі, с пачатку да канца. Цікавы быу з'езд! Цятры, прахадка, цятры... Цялютку почку гуляеш, а потым за працу. Слухаеш лекцыі,—то, другое. Лоўка чытаў прафэсар! Так і влазе табе у галаву. Былі прамовы. Люблю слухаць. Загаворыць—вочы гараць, рукамі выраблая, як ветрак. Мая суседка гэдак сама надта цікавілася... Як пачалі пяяць вечну памяць тым, што згінулі у змаганьні, у турмах,- многа плачу было. Што аб гэтым? Жывому жывое. Цяпер во колькі пісям адгрымліваю, ды ўсё ружовыя... Пачакайце, чуць не забыў. У пачатку зьявіўся да нас Гурко генерал. «На вас, кажа, надзея, вялікая надзея». І далей гэткім кштальтам. Прыемна слухаць ад гэткаго чалавека. Мы—сіла! Вот вам і ўсё, увесь з'езд.

— А аб беларускай справі ні гаварылі?

— Пытаеце а беларускім языку? Як жа? Але гэта пустая рэч, доўга ні трэба і думаць. Калі пачаць вучыцца па беларускаму, гавару адзіні дык будзем таптацца на адным мейсцы. Бо у нас німа Пушкіна, Талстога. Есьць Колас, Купала. Мо ніхто і не чуў пра іх да з'езду, як і я. Нават Дзікенса чытаў, пасватаў чыноўнік адзін, якому гэты пісьменьнік надта падабаўся. Але ня чытаў Якуба Коласа, бо і так ведаю, што дрэнь. Бачыў газэту беларускую. Сьмяхота толькі. Надрукавана гэтак, як чуеш у вёсцы. Аж брыдка чытаць! Тут трэба дэлікацтву вучыца,—«Мэрсі, пардон», без гэтаго не абыдзешся з паненкамі. Нам трэба вучыцца адразу па французку: скора станем на роўну з імі ногу. Пасьпешацца патрэбна, а не выдумляць нейкі свой я з ы к, нейкіе гурткі, краёвую Раду. Нікудышная гэта справа. На гэтым і згадзіліся усе. Мы—беларусы, але хочам вучыцца па—расійску... А з'езд цікавы быў! А ні чулі,—мо скора ізноў паклічуць? І вас пацягну з сабой: грэх ні быць, калі разважаюца гэткія справы. Мы павінны далажыці сваю працу... Почта паехала, га? Трэба бегчы хутчэй, бадай пісьмы ёсьць. А вашай суседцы—маё лепшае пажаданьне. Емкая краля!...

Пэдслухаў і на нашу мову пераложыў.

Зрэбны.

ПА БЕЛАРУСІ.

З Ноўгарадсеверска на Чарнігаўшчыні.

Заходные паветы Чарнігаўск. губ., як напрыклад, Мглінскі, Суражскі, Старадубскі, Навазыбкаўскі і інш. можна напэўна лічыць за беларускіе.

Мова, звычаі, будынкі і вопраткі тут чыста беларускіе. Пад Чарнігавам у гаворцы селян захаваўся цікавы дыфтон, двоегалоснае оу. Чарнігаўцы кажуць: коўнь (конь), на высокоуй гары, галодноўй куме. Гэта так званые к о у і. Можа й сапраўды сама назва Кыёў (Кіёў) найшлося ні ад мыфічнага князя Кыя-Кія. З слова к о у й у гаворцы чарнігаўцаў (пад Лісьцвенам) выходзіць к ы й-(кій): адкуль—Кыёў (Кіеў), бо у летапісах слова К і е у пішацца з літары ы.

У Навгарадсеверскім павеці мова мешаная, на-поў-беларуская, на-поў-украінская, але і ні расійская. Калі на селянскім з'ездзі паўстала пытаньне аб мові у школах, дык амаль ні ўсе прэдстаўнікі селян наўгарадсеверскага павету стаялі на том, што ім больш зразумелая мова расійская, а ні украінская, ці беларуская. Дапраўды-ж мова тутэйшага насяленьня беларуская, але папсована уплывам суседніх гаворак, украінскіх і вялікарускіх. Звыкшы, што да гэтага часу навучэньне у школах выкладалася па-вялікаруску, селяне больш і нахіляюцца да мовы расійскай.

Цяпер для Беларусі паўстае вельмі важнае і разам с тым вельмі труднае пытаньне аб тым, як завесьці у пачатковых школах навучаньне па-беларуску. На гэты вучэбны год можна будзе здаволіцца тым, што завядуць у школі беларускіе лемэнтары. Дзеля гэтага, піўхільна патрэбна як мага хутчэй выбраць камісію з сьвядомых і разумеючых у справе пачатковага навучаньня людзей, здольных і практычных пэдагогаў, дзеля апрацаваньня лемэнтара.

Можна выкарыстаць найлепшые расейскіе лемэнтары, замяніўшы чыста маскоўскіе словы славамі беларускімі, так сама як і апаведаньня з расейскага быту—апаведаньнямі з быту беларускаго.

Па прычыне недастатку у беларускай літэратуры—літэратуры дзіцячай, прыдзецца шмат карыстаць з дзіцячых літэратураў другіх моваў, пішучы пераклады і насьлядаваньня.

Усе падручнікі адразу перэкласьць і апрацаваць немагчыма па тэхнічным варункам: працы гэтай нельга зрабіць у кароткі час, бо і не магчыма, напрыклад надрукаваць усе вучэбнікі адразу.

С пэдагогічнаго пагляду ні досыць перэкласьці, важна даць дзецям матэрыял с свайго роднаго беларускаго быту. Але каліб у вышэйшых аддзеленіях і засталіся расійскія кнігі, дык і там патрэбна карыстацца беларускай мовай. Дыктоўка у новай школі бадай што практыкавацца ня будзе, але пераказы перачытанаго, складаньня пісьменных пераказоў, і пізалежнае складаньне сваіх думак дзеці павінны рабіць на беларускай мові.

Вядома, каб большая часьць беларускіх селянскіх вучыцелёў была за нацыяналізацію школы, дык справа нашла б хутчэй.

На жаль, нашае беларускае вучыцельство не варта свайго паважанаго становішча: адбыўшыся у Мінску вучыцельскі з'езд выклікае сумные думкі. Нашы вучыцельскіе сэмінарыі заставілі у вучыцялёх закваску старога рэжыму. На чарзе стаіць вялікая работа сярод самога вучыцельства і вучыцельскіх сэмінар'ях.

Увод беларускай мовы у сэмінарыю—справа першае вагі, а разам с тым паўстае пытаньне аб складзі вучыцельскаго пэрсоналу у сэмінарыях.

І многа ставіцца рубам розных пытаньнеў, перад труднасьцямі каторых спынящца ня можна.

Вучыцель.

Ст. Жлобін, Магілеуск. губ.

12 чэрвеня сюдой праезджала труппа беларускіх артыстаў «Першаго Беларускаго Т-ва Драмы і Камэдыі» З вакна вагону, у якім былі артысты, выкінулі некалькі беларускіх газэт і адозваў. Калі цягнік затрымаўся на станцыі, то селяне, салдаты і служачые станціі пачалі падыходзіць да вагону артыстаў, просючы газэт і адозваў.

Просьбу іх споўнілі, і пізабавам каля вагону сабраўся цэлы мітынг. Бадай што ня з бою бралі адзін перад другім газэты. Чутны былі клікі: «і я беларус! і я хачу нашай газэты!»

Калі газэты і адозвы былі усе раздадзены, то з вагону сказалі, што ёсьць крыху беларускіх кніг, але за тые ужо трэба плаціць грошы. У момэнт да вакна падняліся рукі з грашыма, просючы кніг. На жаль, кніг было надта мала.

Служачые станціі вельмі прасілі артыстаў паставіць у Жлобіні беларускі спэктакль. У гэтым абецаў сваю помач і мейсцовы «камітэт вучашчых і вучашчыхся».

Артысты абецаліся прыехаць пасьля Купальля.

Жлобінскі.

Магілёў на Дняпры.

7, 8, 9, 10 і 11 чэрвеня у Магілёўскім гарадзкім тэатры адбываліся беларускіе спэктаклі «Першаго Беларускаго Т-ва Драмы і Камэдыі».

Забілася сэрцэ хутка-хутка... Вун яна! Ня ўся—бо ад дарогі закрывае яе старая груша, але паміж зялёных галін блішчыць, як залатая, саломеная страха... Во, страха новенькая!..

Не, гэта толькі здавалася, што вёска такая непрыветная... З блізка саўсім, саўсім другая!..

«Тпру! стой, кося!»

Адчыняны вароты, вымяцены падворак, пасыпана жоўценькім пясочкам...

«Мамачка! Мілая!»

Якая старэнькая, сівенькая, бедная...

Цалуе Наталку і сьмяецца, і плачэ...

У хаце прыбрана, памыты лавы, стол, падлога, чысьценькіе шыбкі маленькіх ваконцаў... Гэтак толькі к Вялікадню прыбіралі Васілёвы сваю хатку, гэтак прыбралі на прыезд свайго мілога дзіцяці...

Садзіць маці за стол Наталку, дае бліны, яешню, нясе гаршчочак с цыкор'яй...

І хочэ есьці Наталка, хочэ паказаць што яна—не «гарадзкая»... Але бліны кіслые, цыкор'я паранкай пахне...

—Адвыкла ты, дачушка, ад нашай яды.

—Ды не, мамачка, але мне есьці ня хочыцца, пасьля...

Вядуць Наталку праз сенцы у новую сьвятлічку. Гэту сьвятлічку зрабілі яшчэ летась, як пісала Наталка, што прыедзе з дзядзькам у госьці... Прадалі цялушку, зарабіў бацька с канём крыху, і вось і сьвятлічка...

Ах, як добра! Пахне аер, пасыпаны на падлозе, адчынена у гародчык ваконцэ, гудуць пчолкі, легкі ветрык калышэ галіны старай грушы і уносе у хатку пах мяты з гародчыка...

. . . .

Цэлы месяц перабыла Наталка дома. Праз гэты час памагала яна бацьком у іх цяжкай працы, вучылася, прыпаміпала гэту работу, аб якой ужо забылася у горадзі; хадзіла «на сяло», да дзеўчат, была разоў два на вячарынках і кірмашох.

Хацелася, вельмі хацелася пачуць Наталцы, што яна такая самая, «вясковая» і пачуць гэта ня толькі ад людзей, але і ад самой сябе. Але і дзеўчаты і хлопцы стараніліся ад Наталкі, а калі гутарылі з ёй, то саўсім не так, як з раўнёй. І, заглянуўшы у сваё сэрцэ бачыла Наталка, што ня можэ ужо кахаць так вёску, як даўней, ня можэ так цяжка працаваць, ня можэ ахвотна гуляць на кірмашох і вечарынках, што на жарты і паступкі вясковай моладзі і глядзець ня хочыцца, і што думкі яе—і думкі гэтай моладзі—саўсім другіе, іншые...

А калі бацькі сталі угаварываць Наталку, каб асталася пры іх і вышла замуж за Тодара Канцавога, за каторага, як яны казалі, кожная дзяўчына ахвотна пайці згадзілася-б, Наталку схапіў такі страх, што яна чуць стрымала слёзы і выбегла наўцекі с хаты.

З Ядзей, паненкай, як расталіся так і спаткаліся добрымі таварышкамі. Падчас забегала Ядзя да Наталкі, і разам ішлі яны у ягады, гутарылі, сьмяяліся. Хадзіла часта і Наталка у двор. І калі садзелі яны у дворным садзе, пад дубам, на каторым калісь то вешалі калыску, калі вясёлая гутарка ракой лілася, тады думала Наталка што і яна мае таварышку. Але калі толькі прыходзілі таварышкі Ядзі, пачыналася другая гутарка. Дзеўчаты гаманілі аб усім тым, аб чым так ахвотна гукае моладзь, і аб чым Наталка ні магла, не умела гаманіць,—тады, о, тады чула Наталка, што яна і тут чужая, адзінокая... . .

. . . .

Зноў усе рэчы Наталчыны зложэны. Заўтра яна выезджае у горад. Зноў плачэ маці, уздыхае бацька, а Наталцы так цяжка на сэрцы, што і сказаць нельга.

«Чаго мне трэба? Чаго я хачу?» —пытае Наталка сябе: «чаму так сумна, так цяжка на сэрцы? Чаму мне ня хочэцца ехаць, а сілы нехватае астацца тут?..»

Вечар. Летні... не, ужо ня летні, а васеньні, ціхай, першай пагоднай восені. Мігацяць зьвёздачкі у цёмпасінім небі, пакаціўся белы туман над рэчкай, крычыць тужліва сава, а здалёку нейдзе нясецца песьня «восені», такая сумная і жаласьлівая, што Наталцы трудна слухаць яе і змогі нема ня слухаць—бо толькі сягоньня, апошні раз чуе яна гэту песьню, а заўтра, заўтра... Ах як цяжка на сэрцы!.

Чысьценькая, відная сьвятлічка... А колькі цяжкай, мазольнай працы прылажыў Наталчын татка, зарабляючы с канём у лесі, каб збудаваць гэту сьвятлічку... для Наталкі...

Ах вельмі, вельмі многа працаваў мусіць ён, калі так без пары састарэў... А мамка? Божэ! Як нудна, як маркотна ім тут будзе без Наталкі!..

Як пясьцілі, шкадавалі бацькі яе, калі малым дзяцёнкам была!.. Як шкадавалі яе, калі занядужаўшы лежала... А яна? А цяпер? Цяпер, калі ім, бацьком, патрэбна Наталка, патрэбна як помач у працы і як ясны праменьчык сонца, каб развесяліць і сагрэць іх адзінокую старасьць—яна цяпер паедзе?..

Не, не, не паедзе, яна астаецца з бацькамі... Чаму так цяжка, так трудна на сэрцы?!.

—Ды не—кажэ нейкі другі голас у душы Наталкі—ты не астанешся! Ты ня можэш тут астацца! Што-ж ты паможэш бацьком? Німа ужо у цябе змогі так працаваць, як даўней, і цярпеньня у цябе ня хвапе патураць ім. Гэта твае бацькі—але яны іншые—ты—іншая... Ты ім чужая... Ты усім чужая!.. Падабаецца табе вясковая моладзь?—з нейкай горкай ironiей пытае той-жэ голас:—жарты іх, гульні, паступкі? А Тодар? Памятаеш, як анагдай пабіўся ён с Пятрусём Ігналёвым? Як лаяўся? І ты, ты хочэш астацца тут?! А моладасьць твая, Наталачка? Ах, яна пяройдзе, і ты яе ня верніш, ня--вер--ніш ані аднаго дзянёчка, ані хвілінкі... Цяпер тваё жыцьцё ,твая краса... Ты па--е—дзеш...

Ах, Божэ! Каб скарэй дзень! Каб скарэй перашла гэта цёмная, сумная ноч, поўная такіх цяжкіх мар, горкіх дум!.. . . . .

Вакзал. Шмат народу, усе бегаюць, сьпешаюцца...

Наталка ужо у цягніку, зараз паедзе. Глядзіць праз вакно на свайго старэнькага татку, каторы так сама глядзіць, ня можэ наглядзецца на сваю Наталачку. Мо' апошні раз бачуцца яны? Мо' апошні раз бачыла яна ужо і мамку? Ой, як цяжка, балюча на сэрцы... Каб скарэй паехаць!..

Татка! Татка! Даруйце сваёй беднай Наталцы! Яна шчыра кахае вас, шкадуе,—любе вёску, любе усіх... Але яна ужо усім чужая! Нейкая сіла адарвала яе ад роднай старонкі і кідае у чужыну... Бывайце здаровы; жывіце шчасьліва!..—І хочыцца Наталцы кінуцца да рук бацьку, хочыцца сказаць яму усё, што думаецца...

Дзынь! Дзынь! Дзынь!—трэці званок... Уздрыгануўся цягнік, цяжка падаўся наперад... Стаіць ішчэ Наталчын татка, толькі твар рукамі закрыў...

. . . .

Лётам птушкі імчыцца цягнік, кідае у паветрэ снапы іскраў, клубы пары і сьпевае Наталцы песьню:

«Чужая! Чужая! Чужая!..»

Вясёлка.

Газэта „Вольная Беларусь" па тэхвічным варункам будзе выходзіць раз на тыдзень да таго часу, пакуль ні адтрымаецца заказаны у Петраградзі шрыфт для уласнай друкарні.

РЭДАКЦЫЯ.

Ставілі «Паўлінку» «Сягоняшніе і даунейшые», «Міхалка», «Пашыліся у дурні», «У зімовы вечар» і др., а апроч гэтаго дэклямацыі, сьпевы і танцы.

Наагул усе артысты ігралі добра, асабліва выдзеліліся Ф. Ждановіч, Янка Беларус, і Вера Тарасік, а дэклямацыей—Люба Тарасік і Пэля Роткевіч.

Магілёуцы горача віталі беларускіх артыстаў.

Вацюк Карпілаускі.

М-ко Ярэмічы Мін. г. Нов. пав.

У 2 гадз. ночы с 30 на 31-е мая, загарэуся селянскі хлеў, ад якога згарэлі два суседніе хлявы. Толькі дзякуючы цішы і таму што гэтыя тры будыніны стаялі водаль ад другіх, пажар не перакінуўся на усё мястэчка.

У гэту ноч, недалёка ад мейсца пажару, быў падрахунак дарожнаго батальёну, і усю ноч салдаты цягаліся з дзеўчатамі, лазілі па гародах і маглі курэньням як небудзь зрабіць пажар. Але, хутчэй усяго, пажар зрабіла адна гаспадыня—бражніца; бо мусіць у той час варыла там бражку. У яе гэта ужо другі пажар за апошніе два месяцы. Раней у яе згарала гумно, але тады пажар пачаўся ад салдацкіх кухняў.

М. Г-к.

АПОШНІЯ НАВІНЫ.

Агульныя весткі.

На асаблівай парадзі аб склікаваньню Установчаго Сэйму (Учредительного Собранья) разважалася пытаньне аб тым, колькі трэба мець гадоу ад роду, каб карыстацца выбарным правам у Сэйм. Большасьцю 34-х галасоу проці 12-і ухвален 20-і гадовы узрост для усіх грамадзян Расіі, апроч ваенных, каторые будуць карыстацца гэтым правам, ні зьвяртаючы увагі на 20-і гадовы цэнз. У салдатах многа 18 гадовых хлопцаў, дык па закону і яны адтрымліваюць права выбірацъ у Сэйм.

Там-жа гэтак сама разглядалася пытаньне аб тым, ці можна даць выбарнае права членам царавоушага у Расіі дому. Пастанавілі, што гэтым правам карыстаюцца усе прамадзяне Расіі, апроч ні дужых на розум, варьятау, немкау і т. д.

З Заграніцы.

ЦЮРЫХ У ШВЭЙЦАРЫІ. Ад гэтуль паведамляюць, што літоускі, беларускі, жыдоускі і польскі камітэты у Вільні телеграфуюць Бэтман-Гольвэгу, нямецкаму міністру-загадчыку, аб страшэннай смяртэльнасьці ад голаду. Умірае 98 чалавек на 1000.

Падаткі на прыбытка.

У скорым часі, паводлуг цяжкага грашовага становішча Расіі, буд ъ шмат пабольшаны падаткі на усе прыбыткі і, наагул, будзе пабольшана ападаткаваньне. Думаюць палажыць падатак на тых, хто ні адбывае ваеннай службы, а гэтак сама апрацовываюцца праэкты аб падатках на спадшчыну, маентнасьці. хвальваркі.

Агульны расійскі селянскі зьезд за фэдэратыўную рэспублік у.

Селянскі зьезд усей Расіі прыняу гэтакую пастанову:

„Працоуная Расія, дамагаючыся зауседы самай шырокай волі і поунаго самаусьвядамленьня, як для асобнаго чалавека і так, для усіх нацый Дзержавы Расійскай, павінна каб гэтае права адтрымалі і скарысталі усе. Дзеля гэтага. Рада селянскіх дэпутатау усей Расіі кліча расійскае працоунае селянства дамагацца у Установучым Сэймі, каб у Расіі была заведзяна ФЭДЭРАТЫУНАЯ ДЭМАКРАТЫЧНАЯ РЭСПУБЛІКА, у каторай усе народы будуць моць поуную волю будаваць свае жыцьце.

Рада селянскіх дэпутатау усей Расіі глыбока перэканапа, што толькі пры НАЙШЫРЭЙШАЙ АУТАНОМІІ народау, што жывуць у Расіі, бяз уціску аднаго народа другім, можа стварыцца новая і дужая Расія.

З Маскоўшчыны.

КРАНШТАДТ. Рада Р. і С. Дэпутатау знайшла ужо на часі і патрэбным як найхутчэй атдзяліць цэркву ад гасударства, гэта значыць, што цэрква, як кіраунічая рэлігійнымі справамі, няпавінна залежыць ад грашавой дапамогі гасударства. Пажаданьне гэтае ухваляна большасьцю галасоу.

ГЕЛЬСІНГФОРС У ФІНЛЯНДЗІІ. Камандзіры караблеу „Рэспубліка", „Гангут" і крэйсара „Діана" патрабуюць, каб цара прывезлі у Краншдадт, дзе вартаваць яго будуць рэвалюцыйные салдаты. Урэзалюцыі каманды карабля „Гангут" гаворыцца: „Мы трэці раз прымаем нашу пастанову і ня маркуемся жаргаваць. Гэта ужо наша апошняя пастанова. Пасьля гэтага мы станем дамагацца сіламоц!"

З Украіны.

КІЕУ. На пасядзэньні агульна-украінскага зьезду селян адтрымана тэлеграма ад міністра ваяунічых спрау, Керэнскага. Міністр даводзіць, што, паводлуг ваенных варункау, ціпер ні на часі склікаць другі украінскі ваенны зьезд. Зьезд ня згадзіуся згэтым і запратэставау. Паслалі тэлеграму Часоваму Ураду і Радзі Р. і С. Дэпутатау, у каторай працануюць, што заява міністра адбірае у украінцау свабоду сходау, і яны, на моцы гэтага ня прымаюць на сябе адпавядальнасьці за тое, што можа учыніцца, як скутак адабраньня дэмакратычнага права вольнай Расіі.

Разам с тым, зьезд чакае ак найхутчэйшага адказу на прапазацыю дэлегатау украінскай цэнтральнай Рады Часоваму Ураду аб тым, каб у Часовым Урадзі было мейсца украінскаму прэдстауніку як абаронцу іх нацыанальнага права.

КІЕУ. На першы дзень агульна-украінскага зьезду, апрача выбарау прэзідзіума, былі выслуханы прывітаньня ад розных арганізацый.

З асаблівым спагадам зьезд выслухау прывітаньне па-беларуску прэдстауніка кіеуской беларускай грамады „Зорка", Фарботкі. „Хай жыве вільна Беларусь" грымелі па салі словы адказу братняй Украіны.

На гэтым зьездзі, паміж іншымі было пастаноуляна цяпер-жа, нібау на, украінізаваць усе школы і інстытуцыі краю. Дзеля гэтага, зьезд зьвяртаецца да усіх арганізацый адміністрацiуных інстытуцый Украіны с просьбай падтрымаць і дапамаччы адбудаваць аутаномны лад на Украіне.

ХРОНІКА.

Зьезд ксяндзоў беларусаў.

24-25 мая адбыуся у Мінску з'езд ксяндзоу беларусау. З'ехаліся прэдстаунікі з Мінскай губ., Магілеускай і Віленскай,—больш 20-і чалавек. Кіравау з'ездам кс. Абронтовіч, прафэсар сэмінарыі у Петраградзі. На пасядзэньня пускаліся толькі ксяндзы беларусы. На з'езд гэты былі парасыланы гэтакія запросіны:

Цяпер злучаюцца усе. Злучаюцца тыя, каторые ажыуляны адной ідэяй і ідуць да адной мэты, каб разам, злучаным сілами, апрацаваць згодны плян чыннасьці. Ксяндзы беларусы яшчэ ні зарганізаваны, што на моцы пашырэньня беларускаго руху, у цяперашние часы можа фатальна адаклікнуцца на справі каталіцкай і нацыанальнай у нашым краю. Дзеля разгляду спрау, звязаных з гэтым рухам Камітэт арганізацыйны з'езду духавенства беларускаго запрашае вяльможнаго ксяндза на першае пасядзэньня з'езду. каторае адбудзяцца у сераду, 24 мая, а 7-й гадзіні у вечар у г. Мінску (касьцел катэдральны, д. № 6).

I. Дзеля азнаямленьня з агульным становішчам жыцьця касьцельнага, палітычнага і нацыанальнага былі прачытаны і абгаворапы рэфэраты;

1) Рух беларускі і яго стасункі да жыцьця касьцельнаго і каталіцтва па Беларусі. Рэфэрэнт кс. А. Лісоускі.

2) права палітычна—нацыанальная духавенства каталіцкага па Беларусі у цяперашнім часі. Арганізацыя партыі каталіцкай. Рэфэрэнт кс. В. Гадлеускі.

3) Справа духавенства грамадзянска—эканамічная. Рэфэрэнт кс. В. Гарасімовіч.

4) Справа прасьветная. Рэфэрэнт кс. Ф. Абрантовіч.

5) Справа выдавецкая Рэфэрэнт кс. Л. Хвецько.

II. Выбар 5-і камісій: жыцьця касьцельнаго палітычна-арганізацыйнай, школьнай, грамадзянска-эканамічнай і выдавецкай—дзеля падробнага апрацаваньня памяцованых пажаданьняу.

ВАЙНА.

За апошні тыдзень на усіх нашых фронтах было спакойна.

На французкім, англійскім і італьянскім фронтах так сама нічога важнаго не было.

З 18-го чэрвеня на палудпёва—заходнім фронці пачалося нашэ наступленьне.

Нашым войскам удалося прарваць усе тры лініі, узято шмат палонных. Упарты бой ідзе каля вёскі Конюхі.

На другіх фронтах так сама пачалося наступленьне каторае развіваецца для нас добра.

Дэзэртыры.

На падрахунку мобілізацыйнаго аддзелу с 15 мая вярнуліся на фронт 109,027 дэзэртыраў.

БЕЛАРУСКАМУ НАЦЫАНАЛЬНАМУ КАМІТЭТУ у г. МІНСКУ.

Гурток Беларусау салдатау I роты 541 п. Веліжскаго п.

Наш гурток, хоць не мае шырокае арганізацыі, лічыць сваей патрэбай паслаць шчырую падзяку Мінскаму Нацыанальнаму Беларускаму Камітэту за адтрыманые намі газэту «Грамада», ліст і праклямацыі. Шчыра Вам дзякуем, дарагіе працоўнікі, за Вашу цяжкую працу на карысьць роднаго краю.

Паведамляем вас, дарагіе працоўнікі, што арганізацыя наша затрымалася. А затрымалася яна вось чаму: 1] што увесь час цяпер стаім на пазыцыі, а 2] тое, што праўда такі, змарнеу наш народ і хоць трохі назнаў ужо свае імя, але саромяецца свае мовы. Шмат шкодзіць гэтаму яшчэ і тое, што як ні як, а расійцаў у нас больш такі, як беларусаў. Дык вот чаму, нават і сьвядомые трохі нашы таварышы цураюцца арганізацыі—саромяюцца расійцаў.

Нам здаецца, што дзеля таго, каб зарганізаваць салдатаў—беларусаў, каб злучыць іх да грамадзянскай працы, трэба б было, як кажуць цяпер, сфарміраваць нацыанальные Беларускіе палкі; але зноў такі, ні маючы арганізацыі, німа каму за гэтае падаць голасу, ды яшчэ і тое, што цяпер бадай што і ні той час, каб выдзеліваць якую б там ні было нацыанальнасьць, бо армія траціць звязку з гэтым, па нейкі час сваю моц, якой цяпер, дзякуючы цемры і несьвядомасьці саміх салдатаў, сказаць праўду, і так ні хват.

З болям у сэрцы пазіраем на гэта і на тых нашых таварышаў, што блізка жывуць каля нас і не далучаюцца да кружка. Праўда, газэту, што атрымалі мы 10 экзэмпляраў, расхваталі, нават у нас самых німа цяпер яе адрэсу, але працы, якая цяпер патрэбна, чакаць ад гэтаго нельга, бо людзі забітые і ім саўсім цяжка вертацца да нацыанальнаго самаусьвядамленьня. Мы добра ведаем, хто вінен у тым, што народ наш так пакрыўджаны. Гэтаму вінен стары парадак, які вырывау з нашаго народу усё лепшае, што там радзілася, каб больш ніколі нам не вярнуць назад. І вось цяпер, калі патрэбна безупынна праца дзеля адраджэньня бацькаўшчыны, шчырых працоўнікаў асталося вельмі мала.

Пра вёску мы нічога пакуль што ні ведаем, што там тварыцца. Хочацца верыць, што там лепш ідзе справа, але хтоб нам памог, салдатам? Дзе наша інтэлігэнцыя, як напрыклад, афіцэры? Чаму яны ня прыдуць да нас, як украінцы, ці іншые да сваіх. Няўжож яны ня мацюць пачуцьця? Камуж здаецца тут не працаваць, калі не ім? Іх жэ у нас не то што каб не было, яны ёсць і іх нават шмат, але яны не цырызнаюцца. Эх, кепска нашаму беднаму гаротнаму селяніну і салдату, што яму ні аткуль німа дапамогі. Але мы самі будзем аб усім рупіцца і маем надзею, што раней ці пазней а будзем і мы людзьмі.

Цяпер ужо частка таварышаў адазвалася на наш вокліч і маняцца біраць грошы на газэту і літэратуру, якіе і прыдзецца паслаць на імя Мінскаго Камітэту.

Просім паведаміць: ці многа ужо ёсьць кружкоў беларускіх і дзе яны, як ідзе іх праца. Калі дзе ешчэ будзе выдавацца наша газэта, то просім прыслаць яе адрэс. Калі ёсьць можнасьць, пішыце да нас лісты і памагайце і навучайце нас.

Ні гневайцеся, што дрэнны склад у нашым лісьці, бо мы людзі ні вучоные і шмат чаго ня можым напісаць так складна, як думаем. Дык бывайце здаровы! Шлём вам прывет з акопаў і самые лепшые пажаданьня у вашай сьвятой працы.

Старшыня: **Андрэй Калядка.**

Пісар: **Апанас Арціховіч.**

[illegible]